УДК 94(476) (043.2)
ББК 63.3 (4 БеИ)
Г 51

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ імя М. Танка

Рэдакцыйная калегія: А.П. Жытко (галоўны рэдактар),
С.П. Барадзін,
А.М. Люты, У.В. Тугай, В.М. Фамін, В.Р. Федарасава

Рэцэнзенты: У.М. Міхнюк, доктар гістарычных навук, прафесар
С.Я. Новікаў, доктар гістарычных навук, прафесар

Г 51 Славянскі свет: мінулае і сучаснае: Матэрыялы Рэсп. навук. канф., 26 сакавіка 2004 г.; Рэдкал.: А.П. Жытко (гал. рэд.) і інш. – Мн.: БДПУ, 2004. – с. 164.

Асвятляюцца актуальныя пытанні гісторыі Славянскіх народаў ад старажытнасці да нашых дзён. Прызначаецца навукоўцам, выкладчыкам і студэнтам вышэйшых навучальных устаноў.

УДК 94(476)(043.2)
ББК 63.3(4 БеИ)

ISBN 985-435-155-6 (ч. 1)

©БДПУ імя М. Танка, 2004

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка"

# "СЛАВЯНСКІ СВЕТ: МІНУЛАЕ І СУЧАСНАЕ"

Матэрыялы Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі

26 сакавіка 2004 года

У 3-х частках

Частка 1

Мінск 2004

ло много мелких крестьянских промыслов и ремёсел с ручными приводами для подачи воздуха в печь при получении железа.

Для постройки рудни необходимо было разрешение властей. Во второй половине XVIII в. феодал имел право сооружать рудни на своей земле, сообщив только об этом властям. Чаще всего феодалы сдавали эти предприятия в аренду или на откуп. В роли арендаторов и откупщиков выступали рудники-мастера и ремесленники. Это было связано с тем, что для организации рудничного дела нужно было иметь определённые технические знания: уметь найти место для постройки рудни, определить количество и качество железной руды, обеспечить производство соответствующим оборудованием, а иногда и рабочей силой [10].

В сравнении с XVII – первой половиной XVIII вв. численность руден в исследуемый период резко уменьшается. Если в период средневековья их насчитывалось в Беларуси несколько сотен, то во второй половине XVIII в. в Брестском старостве, например, насчитывалось уже только 5 руден, Речицком – 2, Мозырском – 2 [11].

К концу XVIII в. эти промыслы и ремёсла исчезают окончательно, оставив память о себе только в названиях белорусских селений (Рудня, Руденка, Дымарка и т.п.).

Таким образом, низкие темпы развития ремесла в сельской местности во второй половине XVIII в. определялись сохранением натурального характера крестьянских хозяйств, господством феодально-барщинной системы хозяйства, неограниченным ввозом иностранных товаров, узостью внутреннего рынка и политикой Речи Посполитой в Беларуси.

### Литература


1. Болбас М.Ф. Развитие промышленности в Белоруссии (1795-1861 гг.). – Мн., 1966. С. 45.

2. Бураковская Н.И. Промыслы и ремёсла в период разложения феодализма и утверждения капитализма (конец XVIII – XIX вв.) // Автореферат дисс. канд. ист. наук. – Мн., 1982.

3. AGAD: Archiwum Tysenhauzow. Dz. B, sygn. 32. S. 83; Dz. D, sygn. 23/166. S. 12; sygn. 25. S. 9; Dz. B, sygn. 44/136. S. 22.

4. Ленин В.И. Полн. соб. соч. Т. 3. С. 329.

5. Там же. С. 330-331.

6. Бураковская Н.И. Указ. соч. С. 22.

7. НИАБ, ф. 295, оп. 1, д. 1147, л. 24.

8. Зеленский И. Материалы для географии и статистики России: Минская губерния. – СПб., 1864. Ч. 2. С. 116.





9. Juliusz Bardach, Boguslaw Liesrodorski, Michal Pietzak. Historia panstwa i prawa polskiego. – Warszawa, 1985. S. 81.

10. Гнип П.Н. Чорна металургія Полісся. // Вісник Академії наук УРСР. 1955. № 3. С. 41.

11. Федоренко П.К. Рудни Левобережной Украины в XVII–XVIII вв. – М., 1960. С. 45.


## ФАБРЫЧНА-ЗАВАДСКАЯ ВЫТВОРЧАСЦЬ НА БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVIII – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XIX ВВ.


*Л.Э. Дзічкоўская*

*г. Мінск*


Пераход ад простай таварнай вытворчасці, заснаванай на прыватнай уласнасці на сродкі вытворчасці і асабістай працы, да капіталістычнай ішоў па шляху "...скаплення даволі значнага капіталу, які ўтвараецца часта не ў сферы вытворчасці, а ў сферы гандлю і інш." [1, 340], і колькасці наёмных рабочых. Ужо пры 5 рабочых на адным прадпрыемстве адбываецца пэўная мадыфікацыя, праяўляюцца перавагі сярэдняй рабочай сілы.

Прадпрыемствы з колькасцю працоўных да 5 чалавек былі ні чым іншым, як рамеснымі майстэрнямі, якія былі ўключаны ў справаздачы губернатараў у якасці "фабрык і заводаў". Больш высокай формай кааперацыі, заснаванай на падзеле працы, была мануфактура, дзе рабочых было звыш 15 чалавек, якія не мелі паравых рухавікоў.

Аналізуючы фабрычнада-завадскую статыстыку, можна выдзеліць мноства прыкмет фабрык і заводаў. У якасці асноўнага разгледзім наяўнасць паравога катла ці паравой машыны, лічачы яго найбольш правільным і найбольш паспяхова выбраным. Таму пры падліку колькасці фабрычна-завадскіх прадпрыемстваў удзяляецца ўвага толькі наяўнасці паравога рухавіка, незалежна ад колькасці рабочых на іх. Магутныя паравы рухавік мог прыводзіць у рух некалькі станкоў, ствараючы ўжо вышэйшы рад вытворчай кааперацыі - кааперацыю машын. Са з'яўленнем першых рухавікоў у прамысловасці Беларусі быў пакладзены пачатак яе глыбокай тэхнічнай перабудова. Аднак перадумовы ўзнікнення фабрычна-завадскога прадпрыемства былі створаны развіццём рамяства, простай кааперацыі і мануфактуры. Менавіта яны ўстанавілі тэмпы і ўзровень буйнай капіталістычнай вытворчасці ў другой палове XIX ст.

У.І. Ленін адзначаў, калі б у мінулым не было працяглай эпохі падрыхтоўкі рабочых мануфактурай, буйная машынная індустрыя не магла б так хутка развівацца ў парэформенны перыяд.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Магчыма прасачыць дынаміку не толькі колькасці прамысловых прадпрыемстваў за перыяд з сярэдзіны XVIII ст. да 1861 г., але і змены характару вытворчасці: ад простага таварнага, заснаванага на феадальных адносінах, да мануфактурнага і фабрычна-завадскога з шырокім выкарыстаннем вольнанаёмнай працы. Калі ў перыяд з 1750 да 1774 г. у Беларусі налічвалася 31 прамысловае прадпрыемства і толькі на адным з іх працавала 5 вольнанаёмных, а ўсе астатнія функцыянавалі за кошт эксплуатацыі прыгоннай працы, то ў апошняй чвэрці XVIII ст. са 152 прамысловых устаноў на 56 прадпрыемствах выкарыстоўвалі працу вольнанаёмных. У першай трэці XIX ст. такіх прадпрыемстваў налічвалася ўжо 192, а ў другой трэці – 259 [2, 60-62].

Асноўная частка капіталістычных прадпрыемстваў была сканцэнтравана галоўным чынам у гарадах, і яны былі ў асноўным дробнымі і недаўгавечнымі.

Звесткі дазвадяюць даць якасную характарыстыку гарадской прамысловасці. Так, напрыклад, з 98 прамысловых гарадоў Віцебскай губерні ў 20-я гады XIX ст. 49 (50 %) прамысловых прадпраемстваў былі фактычна рамеснымі майстэрнямі па апрацоўцы скуры, вырабу скураных рэчаў. На гэтых прадпрыемствах працавала 2–3 чалавекі. Акрамя таго, у Віцебску было шмат канатных, піваварных, цагельных і іншых дробных прадпрыемстваў, на якіх таксама працавала менш 5 рабочых [3, 147].

У другой палове XVIII ст. у гарадах Беларусі пераважала дробнатаварная гарбарная вытворчасць (37) і суконна-талесная (10). Іншыя галіны прамысловасці былі прадстаўлены адзінкавымі прадпрыемствамі. У перыяд з 1810 да 1819 г. назіраўся рост суконна-талесных прадпрыемстваў(17), а таксама гарбарных (7). Астатнія галіны па-ранейшаму прадстаўлены былі нязначна (1-2 прадпрыемствы). У 20-я гады XIX ст. колькасць гарбарных прадпрыемстваў вырасла да 65, суконна-цялесных засталося столькі ж – 17 [4, 63].

У першай палове XIXст. з'явіліся першыя фабрычна-завадскія прадпрыемствы. Калі да канца 20-х гадоў у Беларусі дзейнічала адно фабрычна-завадское прадпрыемства, заснаванае на прыгоннай працы, то ў 30-50-я гады іх налічвалася ўжо 20 і 11 з іх былі фабрыкамі капіталістычнага тыпу.

Прадпрыемствы, колькасць працоўных на якіх не паказана ў справаздачах гарадскіх улад і губернатараў, можна аднесці да прадпрыемстваў першай і другой груп, г.зн. да рамесных майстэрняў ці дробных прамысловых прадпрыемстваў, таму што прадпрыемствы мануфактурнага тыпу не толькі фігуравалі ў агульных справаздачах, але па гэтых



прадпрыемствах у абавязковым парадку складаліся ўладальнікамі дастаткова падрабязныя апісанні з указаннем года заснавання, аб'ёму вытворчасці, магутнасці, колькасці працоўных, месца закупкі сыравіны і рынку збыту [5]. Нягледзячы на агульны рост колькасці прадпрыемстваў і мануфактурнай вытворчасці, у 40-50-я гады XIX ст. назіралася скарачэнне колькасці гарадскіх мануфактур. Калі ў 30-я гады XIX ст. іх навічвалася 20, то ў канцы 50-х гадоў – толькі 5. Праўда, у гэты перыяд у гарадах Беларусі з'явіліся першыя фабрыкі: 3 мукамольныя (у Віцебску, Магілёве і Пінску) і цукровыя - у Беліцы. Аднак сцвярджаць, што фабрычна-завадская вытворчасць выцясняла мануфактурную, неправамерна, бо з'явіліся фабрыкі менавіта у той галіне, у якой мануфактур на працягу ўсяго перыяду не было. Хутчэй за ўсе частка мануфактур спыняла сваё існаванне ў выніку канкурэнцыі вотчыннай прамасловасці і прывазных прамысловых вырабаў.

На 7 гарадскіх мануфактурах у пачатку XIX ст. выкарыстоўвалася праца прыгонных сялян саміх уладальнікаў, а на 3 мануфактурах – праца вольнанаёмных рабочых. Гэта былі мануфактуры капіталістычнага тыпу.

У канцы 30-х гадоў XIX ст. усе мануфактуры былі прадпрыемствамі капіталістычнага тыпу. У 50-я гады XIX ст. усе прадпрыемствы мануфактурнага тыпу тасама былі капіталістычнымі.

Таксама неабходна вызначыць сацыяльны склад уладальнікаў прамысловых устаноў на працягу другой паловы XVIII – першай паловы XIX ст. На працягу гэтага перыяду ён змяняўся. Напрыклад, з 63 уладальнікаў у гарадах Беларусі ў канцы XVIII ст. – 46 чалавек былі мяшчанамі, 15 – дваранамі і 1 купцом. У канцы 30-х гадоў XIX ст. з 87 уладальнікаў 62 чалавекі былі мяшчанамі, 18 чалавек – купцамі і 7 чалавек дваранамі, а ў 50-я гады XIX ст. уладальнікамі ў гарадах былі купцы і мяшчане.акрамя того, многія дваране уладальнікі самі не займаліся вытворчасцю, а здавалі свае прамысловыя прадпрыемствы ў арэнду, а затым прадавалі іх мяшчанам і купцам [6, 1-123]. У цэлым у Беларусі сярод уладальнікаў прамысловых прадпрыемстваў пераважалі прадстаўнікі дваранства. Існуючае манапольнае права памешчыкаў на вінакурства і на бясплатную рабочую сілу затармажвала не толькі прымяненне вольнанаемнай працы, але і рост колькасці купецкіх прадпрыемстваў.

Гэта тлумачыцца не толькі тым, што дваране выкарыстоўвалі манапольнае права ўласнасці на зямлю, сыравіну і бясплатную працу прыгонных сялян, але і тым, што патэнцыяльныя ўладальнікі купецкіх прадпрыемстваў былі на 90 % прадстаўнікамі яўрэйскай нацыянальнасці, а ім забаранялася не толькі адкрываць прамысловыя і гандлёвыя ўстановы ў сельскай мясцовасці, але і жыць па-за гарадамі і мястэч-



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

камі, а таксама выязджаць за межы яўрэйскай мяжы аседласці без спецыяльнага дазволу [7].

Магчымасці займацца прамысловасцю абмяжоўваліся таксама ў яўрэяў двайным падаткавым прыгнётам і немагчымасцю атрымання крэдытаў. Калі дваране маглі атрымаць пазыку пад залог маёмасці, то купцы-яўрэі толькі пры ўмове паручыцельства ўсяго кагала, які, выдаючы яго, нёс матэрыяльную адказнасць, таму кагалы такіх паручыцельстваў не рабілі, а пазыка пад залог маёмасці купцам-яўрэям не выдавалася [8].

Тармазіла развіцце купецкіх прадпрыемстваў і адсутнасць таннай рабочай сілы. Гэта было звязана з тым, што ва ўмовах феадальна-прыгонніцкай сістэмы не толькі сродкі вытворчасці, але і сам вытворца мала чым адрозніваўся ад сродкаў вытворчасці – ён поўнасцю належыў памешчыку, які быў зацікаўлены ў прымацаванні сялян да зямлі. Таму асноўную масу рабочых на прадпрыемствах складалі мяшчане і збяднелая шляхта, якія захоўвалі ў нейкай меры сваю эканамічную свабоду. Адсюль бачна, што большасць прамысловых прадпрыемстваў, уладальнікамі якіх былі мяшчане ці купцы, былі невялікімі і недаўгавечнымі.

Рамеснікі былі адной з асноўных крыніц папаўнення прамысловасці рабочай сілай, але ж у Беларусі рамяство атрымала дастаткова шырокае развіцце толькі ў гарадах і мястэчках, дзе ў асноўным уладальнікамі і вольнанаемнымі рабочымі былі гаражане яўрэйскай нацыянальнасці. Развіццю купецкай прамысловасці і выкарысанню вольнанаёмнай працы ў сельскай мясцовасці перашкаджалі абмежаванні, звязанныя з наяўнасцю т.зв. "рысы яўрэйскай аседласці". Шырокае развіццё памешчыцкага прадпрымальніцтва ў форме вотчынных мануфактур вызначалася тым, што большасць прадпрыемстваў у гарадах і мястэчках былі дробнымі і недаўгавечнымі, гэта стрымлівала развіцце гарадской прамысловасці. Істотнай прачынай слабога развіцця прамысловасці ў Беларусі ў другой палове XVIII – першай палове XIX ст. была канкурэнцыя з боку больш развітай прамысловасці цэнтральных губерняў Расіі, Украіны, Польшчы, якія пастаўлялі ў Беларусь прамысловыя вырабы дастаткова высокай якасці. Засілле паншчыннай сістэмы перашкаджала фарміраванню кадраў вольнанаёмных рабочых, што стрымлівала развіццё капіталізму (у дадзеным выпадку прагрэсу) у прамысловым развіцці краю.

Стрымлівалі развіццё капіталізму ў прамысловасці Беларусі і вузкасць унутранага рынку і адсутнасць значных купецкіх капіталаў.

Асноўнай прычынай слабага развіцця капіталістычнай прамысловасці (як і ўсёй эканомікі) Беларусі была супярэчнасць паміж неабходнасцю развіцця гандлёвай гаспадаркі і існаваннем паншчыннай сістэмы.

Нягледзячы на складаныя ўмовы развіцця прамысловасці Беларусі, у апошняй чвэрці XVIII ст. дастаткова выразна прасочваецца працэс зараджэння новых буржуазных адносін.

Рост колькасці прамысловых прадпрыемстваў і развіццё гандлю паступова адрывалі частку гараджан ад заняткаў сельскай гаспадаркай і рамяством, аднак у дарэформенны перыяд гэты працэс характарызаваўся нізкімі тэмпамі. Шырокае развіццё памешчыцкага прадпрымальніцтва ў Беларусі ў форме вотчынных мануфактур стрымлівала развіццё гарадской прамысловасці, аднак не магло затрымаць працэс перарастання дробнатаварнай капіталістычнай вытворчасці ў мануфактурную.

Прыгонны лад стрымліваў развіццё капіталізму ў сельскай гаспадарцы і прамысловасці, што асабліва яскрава праявілася ў Беларусі. Але такія з'явы, як прымяненне наёмнай працы, вытворчасць на рынак, занепад прыгонных мануфактур, развіццё новых форм гандлю, рост гарадоў сведчылі аб разлажэнні феадальна-прыгоннай сістэмы і зараджэнні капіталістычных вытворчых адносін.

**Літаратура**


1. Ленин В.И .Полн. собр. сич. Т. 3.
2. Болбас М.Ф. Развитие промышленности в Белоруссии (1795-1861 г.). – Мн., 1966.
3. Лютый А.М. Социально-экономическое развитие городов Белоруссии в конце XVII – п.п. XIX в. – Мн., 1987.
4. Болбас М.Ф. Развитие промышленности в Белоруссии (1795-1861 г.) – Мн., 1966.
5. РДГА ў Санкт-Пецярбургу, ф. 1350, оп. 312, д. 90, л. 40; ф. 1281, оп. II, д. 81, л. 45.
6. История БССР. – Мн.,1954.
7. НГАБ у Мінску, ф. 295, оп. I, д. 70, л. 5-224; д. 73, л. 5-221; д. 83, л. 14; ф. 1430, оп. I, д. 422, л. 1-113.
8. РДГА ў Санкт-Пецярбургу, ф. 17, оп. I, д. 189, л. II; д. 194, л. 27-28об., д. 200, л. 1-7.






РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ